энергоресурсы. К началу 1941 г. в Белоруссии работало 32 гидростанции суммарной мощностью 1400 кВт[14]. Это были небольшие предприятия, построенные преимущественно в сельской местности, энергия которых использовалась для освещения общественных построек, домов колхозников и электрификации трудоемких процессов производства. По потреблению электрической энергии на душу населения республика еще значительно отставала от среднесоюзного уровня.

[1] См.: Итоги выполнения первого пятилетнего плана развития народного хозяйства БССР. Мн., 1933. С.31.
[2] Там же.
[3] Там же. С.38, 107.
[4] ГА Гомельской области. Ф.296, оп.1, д.237, л.92–94.
[5] Рабочий. 1930. 18 июля.
[6] См.: Матэрыялы к дакладу ўрада БССР XI з'езду Саветаў. Мн., 1935. С.48.
[7] См.: Звязда. 1930. 29 кастр.
[8] НА РБ. Ф.700, оп.2, д.81, л.167.
[9] НА РБ. Ф.69, оп.3, д.50, л.7, 10; Матэрыялы к дакладу ўрада БССР XI з'езду Саветаў. С.48.
[10] Сацыялістычнае будаўніцтва. 1935. №1–2. С.44.
[11] См.: Основные итоги развития народного хозяйства БССР за 2-ю пятилетку и наметки на 3-е пятилетие. Мн., 1939. С.23–24.
[12] См.: Народное хозяйство Белорусской ССР за 40 лет. Мн., 1957. С.99–100.
[13] См.: Советская Белоруссия. 1940. 16 мая.
[14] См.: Гидроэнергетические ресурсы Белоруссии. Мн., 1957. С.138.

*А.І.КОТАЎ*

## АДНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЫ Ў ПАСЛЯВАЕННАЙ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСЦЫ (1944–1960)

Вырашэнне задач пасляваеннага адраджэння Беларусі патрабавала павышэння ўзроўню духоўнай культуры людзей, іх свядомасці і стваральнай працоўнай актыўнасці. У сувязі з гэтым важнейшае значэнне набывала дзейнасць агульнаадукацыйнай школы ў вёсцы, жыхары якой складалі ў 1940–1959 гг. абсалютную большасць насельніцтва рэспублікі (79–69%)[1].

Аднаўленне работы школ у рэспубліцы пачалося ўжо восенню 1943 г. Па стану на 15 лістапада заняткі вяліся ў 259 школах вызваленых раёнаў Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай і Палескай абласцей[2].

У ліпені 1944 г. уся тэрыторыя Беларусі была вызвалена ад акупантаў. І ўжо 3 жніўня 1944 г. ЦК ВКП(б) прыняў пастанову "Аб бліжэйшых задачах партыйных арганізацый КП(б) Беларусі ў галіне масава-палітычнай і культурна-асветніцкай работы сярод насельніцтва", у якой абавязаў СНК БССР і ЦК КП(б)Б аднавіць у вызваленых раёнах да пачатку 1944/45 навучальнага года сетку пачатковых сямігадовых і сярэдніх школ, ахапіць навучаннем усіх дзяцей школьнага ўзросту.

Аднак гэта задача ў ваенных умовах не магла быць вырашана ў поўным аб'ёме: асноўныя сродкі і намаганні народа накіроўваліся на барацьбу з фашысцкай Германіяй. У 1944/45 навучальным годзе ў рэспубліцы ўдалося адчыніць 1146 пачатковых, 267 няпоўных сярэдніх і 45 сярэдніх школ, у якіх прыступілі да вучобы 1200 тыс. вучняў (супраць 1691 тыс. у 1940/41 навучальным годзе)[3]. У асабліва цяжкім стане знаходзілася сельская школа: не хапала педагагічных кадраў, школьных памяшканняў, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.

Адразу пасля заканчэння вайны пачалося паскоранае вырашэнне шэрагу карэнных праблем дзейнасці школ, падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў для вёскі, удасканалення вучэбна-выхаваўчай работы. Напрыклад, у маі 1945 г. было зацверджана Палажэнне аб узнагароджанні выпускнікоў сярэдніх школ залатым і сярэбраным медалямі, цераз некалькі месяцаў публікуюцца пастановы аб завочным абучэнні настаўнікаў і г.д. Найбольш поўна задачы развіцця агульнаадукацыйнай школы рэспублікі вызначыў Закон аб чацвёртым пяцігадовым плане (на 1946–1950 гг.). Ставілася задача давесці колькасць пачатковых сямігадовых і сярэдніх школ у сельскай мясцовасці БССР да 10839[4].

Нягледзячы на эканамічныя цяжкасці, расходы на асвету ў 1950 г. павялічваліся ў параўнанні з 1946 г. больш чым ў 1,7 раза. А паколькі ў сельскай мясцовасці знаходзілася 94% школ і 71% школьнікаў, то, натуральна, большая частка асігнаванняў прызначалася гэтым школам. У далейшым асігнаванні на асвету штогод павялічваліся і ў 1960 г. склалі 2918981 тыс.руб., або на 82,1% больш, чым у 1950 г.[5]

Аднак, хаця дзяржасігнаванні былі значнымі і пастаянна ўзрасталі, усё ж асноўны ўклад у школьнае будаўніцтва ў самыя першыя пасляваенныя гады ўносілі самі сельскія жыхары, працоўныя калектывы калгасаў, саўгасаў і МТС. Яны аднаўлялі, рамантавалі і ўзводзілі новыя школьныя збудаванні, нарыхтоўвалі паліва, выдзялялі прадукты харчавання навучэнцам, у першую чаргу дзецям-сіратам. На працягу 1946–1950 гг. толькі на сродкі калгасаў было ўзведзена 2764 школы на 2333 тыс. вучнёўскіх месцаў, у той час як на дзяржаўныя – адпаведна 205 школ і 62,5 тыс.месцаў[6]. Гарадскія прадпрыемствы і арганізацыі-шэфы, воінскія часці дапамагалі сялянам набываць будматэрыялы, выдзялялі транспарт, удзельнічалі ў суботніках і нядзельніках па будаўніцтву школ і іншых ачагоў культуры ў вёсцы.

Істотную дапамогу ў будаўніцтве і арганізацыі работы школ на Беларусі ў гэты перыяд аказвалі народы ўсіх рэспублік Савецкага Саюза і ў першую чаргу Расійскай Федэрацыі. Толькі ў 1945 г. Міністэрства асветы РСФСР выдзеліла беларускім школам 1,2 млн падручнікаў, 3 млн сшыткаў, вучэбных дапаможнікаў і абсталявання на суму 5 млрд руб.

У выніку настойлівых намаганняў дырэктыўных органаў, калектываў настаўнікаў, шырокай дапамозе насельніцтва школьная сетка ў рэспубліцы хутка аднаўлялася, павышалася якасць вучэбна-выхаваўчай работы. Важнае значэнне ў гэтым меў пераход да ўсеагульнага 7-гадовага навучання. З восені 1949 г. абавязковае навучанне ў аб'ёме 7 класаў, ужо завершанае ў асноўным у гарадах рэспублікі, было ўведзена і ў сельскай мясцовасці. У пачатку 1950/51 навучальнага года тут працавала 2761 сямігадовая школа (супраць 1517 у пачатку пяцігодкі). Колькасць навучэнцаў у іх павялічылася з 337 да 589 тыс. чалавек. Асаблівая ўвага ўдзялялася развіццю школ у заходніх абласцях Беларусі. Калі ў сярэднім па рэспубліцы за пяцігоддзе колькасць сямігадовых школ павялічылася на 177,6%, то ў заходніх абласцях – на 223,6%. Вялікая работа праводзілася па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці дарослага насельніцтва заходніх абласцей. Паўсюдна адкрываліся пункты і групы лікбезу, навучаннем непісьменных займаліся не толькі настаўнікі, але і спецыялісты прамысловасці і сельскай гаспадаркі, служачыя і ваеннаслужачыя, старшакласнікі. Да канца пяцігодкі непісьменнасць дарослага насельніцтва ў гэтых абласцях была ў асноўным ліквідавана.

На пачатак 1950/51 навучальнага года ў сельскай мясцовасці дзейнічала 11167 агульнаадукацыйных школ, у якіх навучалася 1172 тыс.чалавек[7]. Акрамя таго, вялікую ролю ў павышэнні агульнаадукацыйнага ўзроўню жыхароў вёскі без адрыву ад вытворчасці адыгралі школы сялянскай моладзі.

Работа па расшырэнню сеткі школ у вёсцы, умацаванні іх матэрыяльна-тэхнічнай базы працягвалася ў гады V і VI пяцігодак. З сярэдзіны 50-х гг. пачалі ствараццa школы новага тыпу – школы-інтэрнаты, а таксама групы падоўжанага дня. У 1960/61 навучальным годзе ў сельскай мясцовасці Беларусі працавалі 10672 агульнаадукацыйныя школы з 842 тыс. навучэнцаў[8].

Вострай праблемай пасляваеннага часу было забеспячэнне школ кадрамі кваліфікаваных работнікаў. З-за іх недахопу да выкладання запрашаліся дэмабілізаваныя і рээвакуіраваныя настаўнікі, і нават усе, хто праяўляў схільнасць да педагагічнай работы.

Ужо ў 1944 г. спачатку ў Мазыры, а затым ва ўсіх абласцях рэспублікі адкрыліся настаўніцкія інстытуты. Хутка аднавілі работу Мінскі, Гомельскі, Гродзенскі, Віцебскі, Магілёўскі педінстытуты[9].

Ажыццяўленне абавязковай сямігадовай і пераход да агульнай сярэдняй адукацыі, увядзенне палітэхнізацыі выклікалі патрэбу ў высокакваліфікаваных педагагічных кадрах. У сувязі з гэтым ствараюцца новыя педінстытуты, у тым

ліку Мінскі педінстытут замежных моў, Брэсцкі педінстытут, адноўлена некалькі педвучылішчаў. З 1957/58 навучальнага года настаўнікаў для пачатковых школ пачалі рыхтаваць педагагічныя ВНУ. У 1960/61 навучальным годзе колькасць настаўнікаў сельскіх школ Беларусі склала 62 тыс. чалавек, альбо ў 2,4 разы больш, чым у даваенны перыяд[10].

Адначасова з умацаваннем вучэбна-матэрыяльнай базы, падрыхтоўкай і павышэннем кваліфікацыі кадраў удасканальваліся арганізацыйныя формы кіравання асветай. Раённыя і абласныя аддзелы народнай адукацыі сталі больш кваліфікавана і аператыўна забяспечваць арганізацыйную і метадычную дапамогу сельскім школам.

Трэба адзначыць, што ў пасляваенныя гады закладваліся асновы вырашэння праблемы арганізацыі грамадска-карыснай працы навучэнцаў. Асноўнымі відамі грамадска-карыснай дзейнасці сельскіх школьнікаў у 1943–1945 гг. былі: пасільны ўдзел ў аднаўленны вёсак і калгасных гаспадарак, дапамога сем'ям загінуўшых воінаў і партызан, шэфства над ваеннымі шпіталямі, збор лекавых раслін. У 1946–1960 гг. сельскія старшакласнікі працавалі сумесна з дарослымі ў час пасяўных і ўборачных кампаній. З сярэдзіны 50-х гг. на сяле шырокае распаўсюджванне атрымалі вучнёўскія вытворчыя брыгады.

У адпаведнасці з пастановай ўрада "Аб мерах па ажыццяўленню палітэхнічнага навучання ў школах Беларускай ССР" (ад 28 мая 1956 г.) у вясковых сярэдніх школах уводзілася вывучэнне асноў сельскагаспадарчай вытворчасці, працоўная практыка на прадпрыемствах. Ставілася задача, каб кожны выпускнік сельскай школы ўмеў, карыстаючыся сучаснай тэхнікай і тэхналогіяй, апрацоўваць зямлю, рыхтаваць насенне да сяўбы, вырошчваць расаду, прышчэплівáць пладовыя дрэвы, даглядаць за жывёлай.

Усё гэта садзейнічала абуджэнню цікавасці школьнікаў не толькі да сельскагаспадарчай працы, але і развіццю здольнасцей арыентавацца ў машыннай тэхніцы і хутка прыстасоўвацца да патрабаванняў розных галін народнай гаспадаркі і культуры.

[1] Численность, состав и движение населения в Белорусской ССР: Стат.мат. Мн., 1966. С.13,14.

[2] Гл.: НА РБ. Ф.42, воп.4, спр.5, арк.5.

[3] НА РБ. Ф.4, воп.20, спр.216, арк.6.

[4] Гл.: Закон аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі БССР на 1946–1950 гг. Мн., 1946. С.26.

[5] Разлічана па: Культурное строительство СССР: Стат.сб. М., 1956. С.74; Наука, образование и культура в СССР: Стат.сб. М., 1977. С.39–40; Расходы на социально-культурные мероприятия по государственному бюджету СССР. М., 1958. С.23; НА РБ. Ф.93, воп.9, спр.846, арк.127–128.

[6] Гл.: Народное хозяйство Белорусской ССР. М., 1957. С.213.

[7] Гл.: Народное образование, наука и культура в СССР. М., 1977. С.40.

[8] Разлічана па: Народное образование и культура в СССР. Стат.сб. М., 1989. С.51; Народное образование, наука и культура в СССР: Стат.сб. М., 1977. С.40,41.

[9] Гл.: Короткевич А.Т. Минский пединститут и сельская школа. Мн., 1980. С.10; НА РБ. Ф.42, воп.4, спр.281, арк.881; спр.40, арк.40,41.

[10] Разлічана па: Народное образование, наука и культура в СССР. С.41.